*NEWS FROM BELARUS * БЕЛОРУССКИЕ НОВОСТИ * BIALORUSKIE WIADOMOŚCI * NOTICIAS DE BELARUS * БІЛОРУСЬКІ НОВІНІ *

інтэграцыя

АБАРАНЯЮЦЬ ЗАКОНЫ

Мінскае выдавецтва "Беларусь" выпусціла невялікім тыражом кнігу "Беларусь – Расія. Наш агульны дом". Думаю, што ёю зацікавяцца многія нашы чытачы, бо тут друкуюцца нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць правы грамадзян Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі.

Як піша ва ўступным слове Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі Уладзімір Грыгор'еў, "гэты зборнік можа служыць практычным дапаможнікам для грамадзян Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, органаў дзяржаўнай улады дзвюх дзяржаў".

І сапраўды, кожны грамадзянін Беларусі, які паехаў у Расію на заробкі ці ў госці, можа трапіць у непрадказальную сітуацыю, напрыклад, захварэць. Як, хто і на якіх умовах акажа яму медыцынскую дапамогу? Аб гэтым можна атрымаць падрабязную інфармацыю на старонках 150–162, дзе гаворыцца, што хуткую і неадкладную дапамогу пры раптоўных захворваннях, якія пагражаюць жыццю хворага ці небяспечныя для здароўя іншых, няшчасных выпадках і г.д. грамадзяне дзяржаў Садружнасці могуць атрымаць бесперашкодна, бясплатна для пацыента і ў неабходным аб'ёме ва ўсіх лячэбна-прафілактычных установах дзяржавы часовага знаходжання грамадзян (незалежна ад наяўнасці медыцынскага страхавога паліса).

На старонках зборніка можна таксама знайсці адказы і на пытанні аб дазволе на часовае пражыванне, абмене жылых памяшканняў, атрыманні адукацыі і многія іншыя, з якімі даводзіцца сутыкацца ў паўсядзённым жыцці за мяжой.

Дарэчы, Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы сумесна з Пасольствам Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь рыхтуе выпуск аналагічнага выдання, у якім будуць асветлены пытанні прававога забеспячэння расійскіх грамадзян на тэрыторыі Беларусі.

Таццяна КУВАРЫНА.

стасункі

ЭКАНАМІЧНЫЯ АДНОСІНЫ ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І ЗША РАЗВІВАЮЦЦА

Эканамічныя адносіны паміж Беларуссю і ЗША апошнім часам развіваюцца на даволі добрым узроўні. У нас склаліся пазітыўныя адносіны ў бізнесе. У Беларусі налічваецца 500 сумесных прадпрыемстваў з амерыканскім капіталам. У сувязі з гэтым Беларусь гатова да далейшага пашырэння канструктыўнага дыялога са Злучанымі Штатамі Амерыкі. Аб гэтым заявіў выконваючы абавязкі прэм'ер-міністра Беларусі Сяргей Сідорскі, прымаючы 19 лістапада ў Доме ўрада Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла ЗША ў Беларусі Джорджа Крола.

Сяргей Сідорскі выказаў упэўненасць, што гэта сустрэча паслужыць далейшаму ўмацаванню эканамічных сувязей паміж дзвюма дзяржавамі. Ён таксама падзякаваў ураду ЗША за тое, што ў студзені 2003 года быў падпісаны мемарандум, які рэгулюе пытанні гандлю беларускім тэкстылем. В.а. прэм'ер-міністра падкрэсліў, што Беларусь улічвае ўплыў еўрапейскага і сусветнага рынку і прыкладвае вялікія намаганні для павышэння канкурэнтаздольнасці сваёй эканомікі. Амерыканскія спажыўцы змаглі ў гэтым пераканацца, купляючы беларускую сталеліцейную прадукцыю, шкловалакно, тэкстыль.

Сяргей Сідорскі таксама праінфармаваў пасла аб тым, што цяпер Беларусь займае вядучае месца сярод краін СНД па тэмпах эканамічнага развіцця, узроўні жыцця. У 2003 годзе вызначылася ўстойлівае павелічэнне вытворчасці ўнутранага прадукту, рост якога за першае паўгоддзе склаў 5 працэнтаў, за 9 месяцаў — 6 працэнтаў, за 10 месяцаў — 6,5 працэнта. Чакаецца, што па выніках года будуць атрыманы добрыя паказчыкі эканамічнага развіцця. Аб'ём знешнегандлёвага тавараабароту павінен дасягнуць 15 мільярдаў долараў. Выконваючы абавязкі прэм'ер-міністра таксама падкрэсліў: "Мы будзем вітаць усе вашы намеры садзейнічаць таму, каб амерыканскі капітал адчуваў сябе ўпэўнена ў Беларусі".

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол ЗША ў Беларусі Джордж Крол падзякаваў за сустрэчу і адзначыў, што яна першая з кіраўніком беларускага ўрада. Пасол сказаў, што ў Беларусі ён трэці раз, таму паездзіў па нашай краіне, сустракаўся з прадстаўнікамі ўрадавых і няўрадавых арганізацый. Работа ў Беларусі, лічыць Джордж Крол, дасць магчымасць больш даведацца пра эканамічнае, палітычнае і сацыяльнае развіццё краіны. Нядаўні візіт у Гродна таксама даў магчымасць лепш пазнаёміцца з Беларуссю. Пасол выказаў сваё разуменне тых праблем, якія даводзіцца пераадольваць беларускай эканоміцы ў "перыяд трансфармацыі і пасля распаду СССР". Пры гэтым ён падкрэсліў, што бачыць жаданне ўрада і народа краіны працягваць рэформы ў эканамічнай сферы. Ён таксама заявіў, што ЗША "могуць садзейнічаць інтэграцыі Беларусі ў агульную эканамічную прастору". Джордж Крол адзначыў "жаданне ЗША будаваць далейшыя адносіны з Беларуссю".

На думку пасла, аб'ём інвесціравання амерыканскага капіталу ў беларускую эканоміку, які складае каля 100 мільёнаў долараў, нязначны ў параўнанні з іншымі краінамі. Тут ёсць вялікі патэнцыял для развіцця, улічваючы геапалітычнае становішча Беларусі і "менталітэт беларусаў", падкрэсліў амерыканскі пасол.

Лілія КРАПІВІНА, БелТА.

ад першай асобы

Іліе ВАНЧА, *Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Малдова:*

БЕЛАРУСЬ – ЦУДОЎНАЯ КРАІНА: ТУТ МАЛЯЎНІЧАЯ ПРЫРОДА, ДОБРАЗЫЧЛІВЫЯ ЛЮДЗІ І ВЫДАТНЫЯ ДАРОГІ...

19 лістапада споўнілася 11 гадоў, як былі ўстаноўлены пасля распаду СССР дыпламатычныя адносіны паміж Беларуссю і Малдовай. З нагоды гэтай падзеі Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Малдовы ў Рэспубліцы Беларусі Іліе Ванча адказаў на пытанні нашай газеты.



ДАВЕДКА: Іліе Ванча нарадзіўся 26 студзеня 1949 года ў вёсцы Кышліца-Прут Вулканешцкага раёна Рэспублікі Малдова. Закончыў Кішынёўскі дзяржаўны універсітэт па спецыяльнасці настаўнік гісторыі і сацыялогіі. З 1998 па 2002 год быў дэпутатам Парламента Рэспублікі Малдова, дзе выконваў абавязкі намесніка старшыні камісіі па культуры, навуцы, адукацыі і СМІ, з 2000 па 2002 год - міністр адукацыі РМ, а з мая 2002 года – Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Малдова ў Беларусі, Літве, Латвіі, Эстоніі, а таксама Пастаянны і Паўнамоцны прадстаўнік Рэспублікі Малдова пры статутных і іншых органах СНД.

– Спадар Ванча, вы ўжо паспелі пазнаёміцца з краінай і людзьмі, якія ў вас уражанні?

— Здаецца, прыехаў нядаўна, але прайшло ўжо паўтара года: шмат работы, таму час бяжыць хутка. Пра Беларусь многа добрага чуў яшчэ са школьных гадоў, а ў лістападзе 2000 года ў якасці назіральніка ад малдаўскага парламента быў на выбарах у Нацыянальны сход Беларусі. Ужо тады мяне краіна зацікавіла, але грунтоўна пазнаёміўся з ёю ў апошні час. Паспеў пабываць ва ўсіх абласных цэнтрах. Беларусь — цудоўная краіна: тут прыгожая прырода, маляўнічыя лясы і азёры, уражваюць дарогі еўрапейскага ўзроўню, па якіх я паспеў парадкам пакалясіць. Усюды я меў зносіны з гараджанамі і вяскоўцамі, сустракаўся з высокапастаўленымі чыноўнікамі і з простымі працаўнікамі і хачу сказаць: людзі ўсюды ў вас цудоўныя.

Хацеў бы яшчэ адзначыць, што ў Беларусі беражліва адносяцца да свайго мінулага. Тут шмат гістарычных мясцін: я паспеў пабываць у адрэстаўрыраваным Мірскім замку, у старажытным Полацку, у Брэсцкай крэпасці, у Хатыні, пазнаёміўся амаль з усімі значнымі гістарычнымі помнікамі. Для мяне, як гісторыка, гэтыя паездкі ўяўляюць вялікую каштоўнасць. Вельмі падабаюцца вашы культурныя мерапрыемствы: фестываль нацыянальных культур у Гродне, міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску", свята песні "Залаты шлягер", што нядаўна чарговы раз прайшоў у Магілёве. Ва ўсіх гэтых святах удзельнічаюць і малдаване.

– Як складваецца навуковае, культурнае, гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Малдовай?

— За 11 гадоў паміж нашымі краінамі заключана каля 70 дагавораў, пагадненняў, прыняты шэраг пастаноў на ўзроўні ўрадаў, міністэрстваў, што складае салідную прававую базу для супрацоўніцтва. Самыя значныя з тых, што прыняты ў гэтым годзе: пагадненне аб супрацоўніцтве па забеспячэнні правоў асоб, якія належаць да нацыянальных меншасцей. Гэта пытанне вельмі важнае для Малдовы, дзе каля 30 працэнтаў насельніцтва — нацыянальныя меншасці. У маі пагадненне аб супрацоўніцтве падпісалі міністры абароны нашых краін, а таксама Акадэміі навук, інфармацыйныя агенцтвы БЕЛТА і МАЛДПРЭС.

Тавараабарот паміж нашымі краінамі складае штогод каля 80 мільёнаў амерыканскіх долараў, а сёлета, відаць, будзе каля 90 мільёнаў. Кожны год міжурадавая малдаўска-беларуская камісія прымае рашэнне аб пастаўцы з Малдовы 50 тысяч тон гародніны і садавіны. І яно заўсёды выконваецца. З Беларусі ў Малдову накіроўваюцца трактары. У гэтым годзе ўжо атрымана 400 трактароў, да канца года будзе адпраўлена яшчэ 100. На наступны год плануем закупіць каля 1 000 трактароў. Яны вельмі патрэбны Малдове для апрацоўкі зямлі. Акрамя таго, закупляем тралейбусы, карыстаюцца попытам вашы халадзільнікі, тэлевізары, будаўнічыя матэрыялы, мінеральныя ўдабрэнні, нафтапрадукты, трыкатаж...

Як для Беларусі, так і для Малдовы было б неразумна губляць абжытыя рынкі збыту.

– Якія новыя праекты супрацоўніцтва распрацоўваюцца ў апошні час?

— Для патрэб сельскай гаспадаркі Беларусі ў мінулым годзе было закуплена ў Малдове каля 12 тысяч тон насення кукурузы. Таму абмяркоўваецца праект па стварэнні сумеснага прадпрыемства па вырошчванні насення кукурузы. Уся каньячная прамысловасць працуе ў асноўным на малдаўскай сыравіне. Разглядаецца пытанне стварэння сумеснага прадпрыемства па вырошчванні і перапрацоўцы вінаграду. Добра, калі Беларусь зможа праінвесціраваць гэты праект.

– Спадар пасол, як складваюцца вашы адносіны з малдаўскай дыяспарай у Беларусі? Як, на ваш погляд, жывуць малдаване ў Беларусі і ці часта звяртаюцца па дапамогу ў пасольства?

— Дыяспара наша – адна з самых вялікіх у Беларусі. Так, па перапісу насельніцтва 1999 года, тут пражывае каля 4 тысяч малдаван, у асноўным у Мінску. У вашай краіне яны аказаліся па розных прычынах: хтосьці тут служыў, ды так і застаўся, хтосьці ажаніўся ці выйшаў замуж. Практычна ўсе добра ўладкаваны. Ёсць малдаване, якія займаюць у Беларусі даволі высокае становішча. Напрыклад, Пётр Рагажэўскі — намеснік міністра абароны Беларусі, шмат у беларускай арміі афіцэраў-малдаван. Адзін з іх, палкоўнік Георгій Пушкаш, працуе ў ваенным шпіталі. Ён да таго ж актыўны ўдзельнік усіх мерапрыемстваў, якія праводзяцца "Абшчынай "Малдова", паэт. Антаніна Валько — дырэктар вялікай аптэкі, старшыня абшчыны...

Наша дыяспара актыўна ўдзельнічае ў такіх мерапрыемствах, як фестывалі нацыянальных культур, Дні горада. Нядаўна праводзіўся гарадскі фестываль нацыянальных культур. Было прыемна паглядзець на нашых самадзейных артыстаў. У іх цудоўная праграма. Выступалі яны ў новых касцюмах, якія пры нашым садзейнічанні прыслаў з Кішынёва Дэпартамент міжэт-

нічных адносін (узначальвае спадарыня Таццяна Млечка). Удалечыні ад Радзімы па-асобаму гучаць родныя мелодыі. І я ўдзячны малдаўскай дыяспары, што тыя, каго яна аб'ядноўвае, даўно жывуць за межамі радзімы, але захоўваюць малдаўскія песні, традыцыі і перадаюць іх сваім дзецям.

– Дзецям беларусаў, якія пражываюць за мяжой, прадастаўляюцца льготы пры паступленні ў дзяржаўныя ВНУ Беларусі. Ці ёсць такая прывілея ў Малдове для сваёй дыяспары?

— Шкада, але такіх прывілей няма. Вы мне задалі добрае пытанне. Як былы міністр адукацыі, лічу, што адукацыя ў вас на высокім узроўні. У гэтым годзе ўжо падпісана некалькі пагадненняў паміж Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэтам і Малдаўскай эканамічнай акадэміяй, Беларускім дзяржаўным педуніверсітэтам імя М.Танка і Славянскім універсітэтам Малдовы аб супрацоўніцтве, якое прадугледжвае абмен прафесарска-выкладчыцкім саставам, літаратурай, навуковымі распрацоўкамі. Лічу, што неабходны дагавор аб абмене студэнтамі паміж Беларуссю і Малдовай, які ёсць у нас з іншымі краінамі.

– Калі ёсць вольны час, як вы яго праводзіце?

— Свабоднага часу вельмі мала. Пасольская работа патрабуе шмат напружання. Але калі ўсё ж ён з'яўляецца, люблю хадзіць па вуліцах Мінска. Чысты, прыгожы горад, асабліва з вячэрняй падсветкай. Тут спакойна, і мы з жонкай не праміваем магчымасці схадзіць у парк імя Горкага, наведаць Нацыянальны тэатр імя Янкі Купалы. Бываю ў шахматным клубе, наведваю выставы. Стараюся быць у курсе культурнага жыцця.

– Як ваша сям'я адаптавалася тут?

— Мае сыны вучацца ў малдаўскіх ВНУ, таму мы з жонкай без іх сумуем. Але жонка Марыя цяпер прымае актыўны ўдзел ў грамадскім жыцці. Яна ўваходзіць у камітэт Міжнароднага жаночага клуба жонак дыпламатаў. Яны кожны тыдзень праводзяць экскурсіі, арганізуюць сустрэчы са знакамітымі людзьмі: артыстамі, навукоўцамі, пісьменнікамі, наведваюць прадпрыемствы.

– Не за гарамі Новы год, і звычайна людзі падводзяць вынікі зробленага. Які ён быў для вас?

— Я задаволены годам, задаволены вынікамі. Супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі добрае, паказчыкі паляпшаюцца. З'явіліся ў пасольстве новыя супрацоўнікі: мы адкрылі новы ганлёва-эканамічны офіс. Вось выйшла доўгачаканая "Анталогія малдаўскай паэзіі" на беларускай мове. Па ёй я вывучаю беларускую мову. Вершы мне знаёмыя, таму лёгка зразумець вашу мову. Так што я лічу год паспяховым для мяне і ўсяго калектыву пасольства.

– Дзякуй, што знайшлі час для інтэрв'ю. Поспехаў вам у справе супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі.

Гутарыла **Таццяна КУВАРЫНА.**

з прэс-канферэнцыі

ШУБУ ВАШАЙ МАРЫ

МОГУЦЬ ПАШЫЦЬ У ВІЦЕБСКУ

Няма такой жанчыны, якая не марыць пра цёплую прыгожую шубу, якая б не толькі саграваала, але і прыносіла задавальненне. Такое можа быць толькі, калі шуба зроблена з добрага футра і пашыта сапраўдным майстрам.

Беларускія жанчыны носяць розныя футры — ад шыншылы да труса. Але большасць адзеты зімой у недарагія імпартныя футры з кірмашоў, на якія самі ж наракаюць з-за нізкай якасці.

А між тым на Беларусі ёсць 2 прадпрыемствы, якія вырабляюць свае шубы. У Бабруйску, дзе іх толькі шыюць, працуе 140 чалавек. На Віцебскім футравым камбінаце, дзе поўны цыкл апрацоўкі футра — ад вырабу да дызайну і пашыву, занята 600 чалавек. Аднак айчынная прадукцыя больш дарагая, чым аналагічная імпартная. Гэта тлумачыцца ў першую чаргу коштам сыравіны, далей — сістэмай падаткаабкладання і невялікімі партыямі прадукцыі.

Вытворчасць вырабаў з футра мае сезонны характар. Віцебскі футравы камбінат закупляе толькі беларускую сыравіну — норку, аўчыну, труса. Па словах дырэктара камбіната **Станіслава Панюціна**, якасць футра бывае неаднолькава высокай, але на прадпрыемстве існуе сур'ёзная сістэма яе кантролю. Галоўная праблема — недахоп абаротных сродкаў. Нягледзячы на існуючыя складанасці, Віцебскі футравы камбінат робіць спробу адысці ад сезоннасці — збіраецца шыць вырабы са скуры, рабіць фурнітуру для абутку. І галоўнае — прадпрыемства гатова атрымаць міжнародны сертыфікат якасці ISO-9000, які будзе ўведзены тут у наступным годзе.

Магутнасці камбіната дазваляюць апрацоўваць 200–250 тысяч норак, 300 тон аўчыны і 100 тон труса ў год (гэта прыкладна 2,5 тысячы вырабаў з пушніны і 1,5 тысячы з аўчыны). Пакуль камбінат працуе з загружанасцю 30 працэнтаў, а мог бы забяспечыць сваёй прадукцыяй рынак Беларусі і Расіі, кажа Станіслаў Панюцін і дадае, што гэта краіна з'яўляецца адзіным імпарцёрам іх прадукцыі.

Менавіта ў Расіі ацанілі і якасць дызайнерскіх ідэй спецыялістаў Віцебскага футравага камбіната. Так, на "Восеньскіх днях моды" ў Санкт-Пецярбургу падчас конкурснага паказу былі адзначаны адразу дзве віцебскія футравыя калекцыі. Гран-пры атрымала калекцыя Таццяны Яфрэмавай "Рэкс-тэкс-фэкс", якая была падрыхтавана толькі для дэманстрацыі і не разлічана на масавую вытворчасць. Ірыну Зеніну ўзнагародзілі дыпломам гандлёва-прамысловай палаты за ідэі, якія ў хуткім часе павінны рэалізавацца ў вытворчасці. Такім чынам, у Беларусі ёсць з чаго і каму шыць прыгожыя футры. Справа за нямногім — наладзіць вытворчасць так, каб мы маглі і хацелі купляць менавіта свае футры.

Алена СПАСЮК.

НА ЗДЫМКАХ: удзельнікі прэс-канферэнцыі Ніна ПАШКО (Міністэрства гандлю РБ), Вольга САЛОДКАЯ («Беллегпрам») і Станіслаў ПАНЮЦІН; узоры віцебскіх майстроў даверылі прадэманстраваць аўтару гэтых радкоў.

Фота **Яўгена КАЗЮЛІ.**

дыпкур'ер

ВЫБАРЫ Ў САСТАЎ ЮНСІТРАЛ

18 лістапада 2003 года на пленарным пасяджэнні 58-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН адбыліся выбары 43 членаў Камісіі ААН па праву міжнароднага гандлю (ЮНСІТРАЛ). Беларусь была выбрана ў саставу ЮНСІТРАЛ на шасцігадовы тэрмін паўнамоцтваў, якія пачынаюцца 14 чэрвеня 2004 года.

ВІЗІТ А.ТОЗІКА Ў ПОЛЬШЧУ

Адбыўся афіцыйны візіт старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі Анатоля Тозіка ў Рэспубліку Польшча. Візіт адбыўся па запрашэнні старшыні Вышэйшай кантрольнай палаты Польшчы Міраслава Сэкулы.

Згаданы візіт з'яўляецца першым кантактам кіраўнікоў вышэйшых кантрольных органаў Беларусі і Польшчы за апошнія 7 гадоў.

У ходзе візіту адбыліся перамовы дэлегацый. Кіраўнікамі вышэйшых кантрольных органаў было падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве паміж КДК Беларусі і ВКП Польшчы. Дасягнута дамоўленасць па развіцці супрацоўніцтва ў абмене вопытам у сферы ажыццяўлення дзяржаўнага кантролю, узаемадзеянні ў прафесійным навучанні кадраў, правядзенні паралельных кантрольных мерапрыемстваў, інфармацыйным абмене, была падкрэслена неабходнасць развіцця кантактаў як паміж дэпартаментамі цэнтральных устаноў, так і рэгіянальнымі органамі кантролю Беларусі і Польшчы.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ СЭЗ "ГРОДНАІНВЕСТ" У АЎСТРЫІ

У Федэральнай палаце эканомікі Аўстрыі прайшла прэзентацыя свабоднай эканамічнай зоны "Гроднаінвест".

Да ўдзельнікаў прэзентацыі звярнуўся пасол Беларусі ў Аўстрыі Віктар Гайсёнак.

З паведамленнем аб перавагах і асноўных накірунках інвестыцыйнага супрацоўніцтва з Гродзенскай вобласцю і СЭЗ "Гроднаінвест" выступіў кіраўнік адміністрацыі свабоднай эканамічнай зоны Сяргей Ткачэнка. Прадстаўнікі дзелавых колаў Беларусі падзяліліся вопытам стварэння і функцыяніравання сумесных прадпрыемстваў на тэрыторыі СЭЗ.

Прэзентацыя выклікала цікавасць з боку аўстрыйскіх прадпрымальнікаў.

Прэс-служба МЗС.

дзяржава і дыяспара

У ТАВАРЫСТВЕ «РАДЗІМА»...

Пачатак на 1-й стар.

Пятро Скепка з Гайнаўкі (Польшча) скардзіўся, што беларусы Беласточчыны не бачаць Першы нацыянальны канал Беларускага тэлебачання.

Галіна Сантоцкая з Даўгаўпілса (Латвія) узняла праблему пенсіянераў: у Латвіі не залічваецца іх беларускі стаж. Сама яна кіруе нядзельнай школай, якая мае вялікую патрэбу ў праграмах па навучанню роднай мове, зборніках песень і гульняў, відэа- і аўдыёкасетах з запісамі беларускага фальклору, сцэнарыях каляндарна-абрадавых святаў для дзяцей, моладзі і дарослых.

Паўла Дзягцярыка з Кыргызстана таксама хвалюе пытанне, дзе здабыць праграмы, падручнікі і дапаможнікі для нядзельнай школы. Яно было вырашана вельмі аператыўна — ад'язджаючы дадому, Павел Паўлавіч павёз з сабой неабходныя кнігі. Са свайго боку, ён уручыў падарунак — кнігу "Беларусы ў Кыргызстане".

Многія ўдзельнікі семінара прывезлі з сабой і пакінулі Камітэту па справах рэлігій і нацыянальнасцей, акрамя кніг, фатаграфіі, газеты, часопісы, сувеніры на памяць пра тыя краіны, дзе яны пражываюць, падрабязна расказалі пра сваю работу і дапамогу, якую атрымліваюць ад мясцовых улад і беларускіх пасольстваў.

У цэлым насычаная праграма семінара, які праведзены дзякуючы фінансавай падтрымцы Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей, была выканана і аказала вялікую дапамогу яго ўдзельнікам. Лекцыі, практычныя заняткі, майстар-класы, сустрэчы з удзельнікамі вядомых беларускіх ансамбляў "Вербіца", "Валачобнікі", "Церніца" і іншых, экскурсіі па Мінску, наведванне сталічных тэатраў — усё гэта пакінула незабыўныя ўражанні.

Наперадзе — цікавая работа, адноўлены рэпертуар і трывалыя сувязі з Бацькаўшчынай.

Рэгіна ГАМЗОВІЧ.

прызнанне

Клара ЛУЧКО:

"Я З ЗАДАВАЛЬНЕННЕМ ЗДЫМАЛАСЯ Ў БЕЛАРУСКІХ РЭЖЫСЁРАЎ"

Фота БелТА.

На X Мінскім міжнародным кінафестывалі "Лістапад" ганаровы прыз «За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве» атрымала народная артыстка СССР Клара Лучко.

Клара Лучко актыўна займаецца грамадскай дзейнасцю. Яна — акадэмік Расійскай акадэміі кінематаграфічных мастацтваў "Ніка", акадэмік Нацыянальнай акадэміі кінематаграфічных мастацтваў і навук Расіі "Залаты арол", член савета ветэранаў Саюза кінематаграфістаў Расійскай Федэрацыі. Актыўна падтрымлівае беларуска-расійскае супрацоўніцтва ў сферы культуры. Напрыклад, актрыса дапамагла арганізаваць паездку ў Маскву таленавітым дзецям з Гомельшчыны, якіх цёпла прымалі ў расійскай сталіцы.

Клара Лучко ўдастоена ў гэтым годзе спецыяльнага прыза Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За захаванне і развіццё традыцый духоўнасці ў кінамастацтве", які па традыцыі ўручаецца на адкрыцці Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад". Артыстка прызналася ў сваёй любові да Беларусі. "Я з задавальненнем здымалася ў беларускіх рэжысёраў", — сказала яна. Незабыўныя жаночыя вобразы створаны актрысай у кінастужках, якія ўвайшлі ў залаты фонд айчыннай кінематаграфіі. Гэта, у першую чаргу, знакамітае "Чырвонае лісце" класіка беларускага кіно Корш-Сабліна.

НА ЗДЫМКУ: Клара ЛУЧКО (злева) на фестывалі ў Мінску.

Таццяна КУВАРЫНА.

вандроўка з яўгенам казюлем

Пакуль разважаў наконт накірунку чарговай вандроўкі, тэма, як кажуць, сама ў рукі прыплыла. Запрасілі мяне ў Любань на святкаванне 180-й гадавіны з дня нараджэння вядомага беларускага этнографа, пісьменніка, публіцыста, літаратурнага крытыка і перакладчыка Паўла Шпілеўскага, у час якога павінна была адбыцца фальклорная вандроўка па мясцінах, дзе нарадзіўся і жыў на Любаншчыне наш славуты зямляк. Кампанія мінскіх вандроўнікаў сабралася прадстаўнічая: старшыня беларускага Саюза фалькларыстаў Васіль Ліцвінка, навуковы супрацоўнік лабараторыі беларускага фальклору БДУ Юрась Выдронак, кіраўнік ансамбля "Чароўныя музыкі" Беларускага універсітэта культуры Міхась Слізкі са сваімі музыкамі і яшчэ шэраг неабыякавых да фальклору асоб.

Засталося запрасіць зацікаўленых чытачоў "Голасу Радзімы" і, як кажуць: "Кую-кую ножку – паедзем у дарожку..."

ШЛЯХАМІ ПАЎЛА ШПІЛЕЎСКАГА

***

Пакуль камфартабельны фордаўскі аўтобус імчыць нас па слуцкай шашы, ёсць час завітаць думкамі ў 1823 год, калі 12 лістапада на Любаншчыне, у вёсцы Шыпілавічы, у сям'і прыходскага святара, нарадзілася трэцяе дзіця (усяго ў сям'і іх будзе сямёра). Здавалася, Паўлу лёсам было наканавана пайсці бацькавым шляхам. Чатырнаццацігадовым хлопчыкам пачынае ён вучобу ў Мінскай духоўнай семінарыі. Пасля яе заканчэння – тры гады ў Пецярбургскай духоўнай акадэміі і званне кандыдата багаслоўя. Гады навучання заклалі той магутны адукацыйны падмурак, на якім грунтавалася жыццёвая праца Паўла Шпілеўскага. Гісторыя і філасофія, богаслоўе і мовазнаўства, валоданне лацінскай, грэчаскай, французскай і нямецкай мовамі – не кожны універсітэт мог даць такія веды. І пры ўсім гэтым – глыбокая павага да беларускай мовы, якую ён насуперак існуючым афіцыйным поглядам прапагандаваў. Ён заклікаў вывучаць "...мову, з якой у нас некалі смяяліся і лічылі мовай лакейскай у магнацкіх сядзібах і якая зараз займае ўвагу вучонага свету..." Гэта была мова яго асяроддзя як у Шыпілавічах і навакольных вёсках, так і ў Ігумені ці Лошніцы на Барысаўшчыне, дзе пазней працаваў яго бацька. Ужо ў юнацкія гады П.Шпілеўскі захапіўся вуснай народнай творчасцю, пачаў збіраць яе і сістэматызаваць. Вынікам стаў артыкул "Белорусские поверья", які быў надрукаваны ў літаратурным дадатку да "Журнала Министерства народного просвещения" ў 1846 годзе. Гэта была першая этнаграфічная праца П.Шпілеўскага...

...А тым часам мы ўжо ехалі па вуліцах Любані.

ЛЮБАНЬ

Раённы цэнтр сустрэў лёгкім марозцам і ўсімі прыкметамі свята: транспарантамі, якія віталі ўдзельнікаў вандроўкі, святочнымі афішамі, гукамі гармонікаў і песнямі. Усюды выявы кола — эмблемы свята, якая ўспрымаецца як сцвярджэнне бесперапыннасці народных традыцый, што перадаюцца па колу жыцця ад аднаго пакалення да другога.

Гасцей сустракаюць духмяным караваем (фота 1), уручаюць кіечкі вандроўнікаў і завязаны ў хустачку акраец хлеба з салам — дарога ж няблізкая (фота 2). Удзельнікаў вандроўкі вітае старшыня Любанскага райвыканкама Валерый Грыбанаў (фота 3), які адзначыў: "Сёння нам прыемна і ўсцешна ўсведамляць, што, у многім дзякуючы нашаму земляку, не згубілася ў часе, прайшла праз усе выпрабаванні традыцыйная духоўная культура беларускага народа, што сёння, як і ў часы Шпілеўскага, гучаць беларускія народныя песні, што ёсць людзі, гатовыя адправіцца ў дарогу ўслед за Паўлам Шпілеўскім, каб перадаць нашчадкам нашу багатую фальклорную спадчыну".

Пад пажаданні добрай дарогі ўдзельнікі вандроўкі рассаджваюцца па вазах. Коні, што застаяліся ў чаканні, упрыгожаныя каляровымі стужкамі і кветкамі, жвава пабеглі па бальшаку, што вядзе з Любані праз Арлёва ў Шыпілавічы. То на адным возе, то на другім гучыць пад гармонік песня, якая не перашкаджае думкам вярнуцца да постаці Паўла Шпілеўскага (фота 4).

***

Пасля духоўнай акадэміі П.Шпілеўскі каля пяці гадоў выкладае ў Варшаўскім духоўным вучылішчы, а звольніўшыся, пераязджае ў Пецярбург, дзе працуе ў педагагічным інстытуце. Але ж увесь вольны час аддае паездкам па Беларусі, збіраючы самабытныя прыказкі, казкі, паданні, прымаўкі, песні, складае слоўнік беларускай мовы. Вынікам яго актыўнай працы стала серыя публікацый у часопісе "Пантеон" пад агульнай назвай "Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических поверьях". Асобнай кнігай выходзіць "Путешествие по Полесью и Белорусскому краю". Вялікую цікавасць у навуковых колах выклікалі працы П.Шпілеўскага "Белорусские пословицы", "Очерки Жмуди", этнаграфічны нарыс пра Мазыршчыну і іншыя. І гэта не дзіўна, бо Шпілеўскі фактычна адкрываў сусвету самабытнасць беларусаў як нацыі. Ён прысвяціў шэраг прац беларускай мове, якую афіцыйна ўлады таго часу фактычна не прызнавалі. Апошняе, можна меркаваць, і стала прычынай таго, што працы "Краткая грамматика белорусского наречия", "Заметки белоруса о белорусском языке" і "Словарь белорусского наречия" так і не былі надрукаваны...

Размераны бег коней запаволіўся: мы ўехалі ў першую на шляху вандроўкі вёску.

АРЛЁВА

Шырокая вясковая вуліца літаральна запруджана людам. Уся вёска выйшла сустракаць гасцей. Як на вялікае прастольнае свята, вынеслі абраз, якім благаславілі ўдзельнікаў вандроўкі на добрую справу (фота 5). А жаночы фальклорны гурт заспяваў песню — адну з тых, якія калісьці мог слухаць і запісваць Павел Шпілеўскі. Менавіта пра гэта і казаў Васіль Ліцвінка, разважаючы пра навуковы подзвіг нашага земляка. Абвяргаючы пастулат, што фалькларыста хлебам не кармі, а дай запісаць новую песню, гаспадары вёскі вырашылі, што не песняй адзінай жыў фалькларыст, і запрасілі да стала. Казалі, што душу сагрэла песня, а для цела не пашкодзіць кілішак гарэлкі. Тым больш, што "чарка — не п'янка". Сагрэтая гасціннасцю Арлёва, рушыла вандроўка ў бок Шыпілавіч (фота 6).

ШЫПІЛАВІЧЫ

У гэтых краях я ўпершыню, і мясцовыя краязнаўцы даравалі мне маю недасведчанасць у спробе высветліць, ці захаваліся якія-небудзь матэрыяльныя сведчанні тых часоў, калі тут нарадзіўся будучы даследчык. Нічым не маглі мяне парадаваць: слядоў сядзібы Шпілеўскіх не засталося, як і не захавалася царква Срэцення Гасподняга, дзе служыў бацька Паўла. На яе месцы, на высокім пагорку, жыхары Шыпілавіч паставілі крыж, да якога мы і скіраваліся. Мясцовы святар добрым словам памянуў славутага сына гэтай зямлі і прапанаваў памаліцца за вечную яго памяць (фота 7).

Слухаў айца Мікалая і думаў пра лёс чалавека, якому Богам было адпушчана недаравальна кароткае жыццё, але які столькі паспеў зрабіць. Несправядлівасць яшчэ і ў тым, што мы не можам сёння зазірнуць у дапытлівыя вочы Паўла Шпілеўскага, каб глыбей спазнаць яго сутнасць. Да нас дайшлі часопісы, кнігі і нават рукапісы — і ніводнай гравюры, малюнка з партрэтам Шпілеўскага. Але ж ёсць надзея, што недзе ў архівах ён можа быць. І справа гонару даследчыкаў творчасці Шпілеўскага ліквідаваць гэты прагал.

Але ж дух Шпілеўскага лунае над Шыпілавічамі. Тут ганарацца аднавяскоўцам і шануюць яго памяць, аб чым сведчыць мемарыяльная дошка на вясковым Доме культуры (фота 8). Супрацоўнікі мясцовай бібліятэкі скрупулёзна збіраюць звесткі і публікацыі пра Паўла Шпілеўскага, тут мараць пра стварэнне мемарыяльнага музея.

...І зноў дарога. Пасля кароткага прыпынку ў Рэдкавічах, дзе ўдзельнікі свята пазнаёміліся з незвычайнай выставай мясцовага ткацтва — уздоўж вуліцы, на платах былі развешаны тканыя і вышываныя посцілкі, абрусы, ручнікі, -- мы прыбылі ў апошнюю вёску на шляху вандроўкі.

САРАЧЫ

Гэта вялікая вёска амаль зліваецца з Любанню. Такім чынам, нібы замкнулася кола вандроўкі. Мы шмат чаго ўбачылі, адчулі жывую душу фальклору і цікавасць да яго людзей. Гэта пацвердзіў і вялікі канцэрт, на які сабраліся спевакі, музыкі і танцоры з усяго раёна. Фальклорныя гурты вёсак Закальное і Обчын, Сосны і Ямінск, народныя спевакі Ганна Палазнік з вёскі Кузьмічы, Раіса Слівец з Гарадзяціч, Надзея і Рыгор Навумовічы з Дарасіно, любанскі ансамбль народнай песні "Ярыца", дзіцячы фальклорны гурт "Нашчадкі" з Забалаці (фота 9) — усё гэта багацце талентаў гаварыла само за сябе: жывуць і будуць жыць народныя традыцыі, песні, прымаўкі, жарты. І як добра, што важнасць гэтага разумее кіраўніцтва раёна, якое заснавала тры прэміі імя Паўла Шпілеўскага за дасягненні ў зборы, вывучэнні і прапагандзе фальклору. З'ява, вартая пераймання ўсімі, хто, думаючы пра сённяшні дзень, не забывае пра мінулае.

Сто восемдзесят гадоў мінула з дня нараджэння Паўла Шпілеўскага. Грандыёзныя змены адбыліся за гэты час на любанскай зямлі. Сучасныя тэхналогіі, высокія хуткасці, гіганцкія будоўлі і шмат іншага складаюць уяўленне аб каштоўнасцях сённяшняга дня. І гэта натуральна. Але ж ёсць і вечныя каштоўнасці, такія, як палі, лясы, рэкі, азёры. І яшчэ – народная мудрасць, значэнне якой так добра разумеў Павел Шпілеўскі, сцежкамі якога прайшлі сёння яго паслядоўнікі.

КАНТАКТЫ І ДЫЯЛОГІ
ВЕСТКІ МІЖНАРОДНАЙ АСАЦЫЯЦЫІ БЕЛАРУСІСТАЎ. № 21

Беларускія сенсацыі

Выяўлены партрэт Міколы Гусоўскага?

Дацэнт Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта Жанна Некрашэвіч-Кароткая, адна з нешматлікіх у Беларусі лацініст аў, нядаўна пабывала ў камандзіроўцы ў Кракаве, уважліва даследавала ў славутай Бібліятэцы Чартарыскіх (фарміравацца яна пачынала ў беларускім Падняпроўі, на Аршаншчыне) адзін з двух вядомых сёння ў Польшчы і свеце арыгінальных экземпляраў паэмы Міколы Гусоўскага "Песня пра зубра" і звярнула ўвагу на змешчаны там на апошняй старонцы мужчынскі партрэт.

На думку беларусісткі, у кнізе прадстаўлены не яе выдавец, як мяркуе некаторыя польскія даследчыкі, а сам аўтар. Адным з доказаў таго з'яўляецца аналогія з "Кнігай Іова", выдадзенай крыху раней Францішкам Скарынам у Празе. Партрэт (ці аўтапартрэт) знакамітага першадрукара там таксама знаходзіцца на апошняй старонцы.

Сваімі назіраннямі Ж. Некрашэвіч-Кароткая падзялілася на адкрыцці выставы "Мікола Гусоўскі. Голас XVI стагоддзя (да 480-годдзя выдання паэмы М.Гусоўскага "Песня пра зубра")".

— Кракаўскі рарытэт, — сказала даследчыца, — выдадзены па ўсіх канонах еўрапейскага кнігадрукавання. У ім ёсць прадмова, прысвячэнне каралеве Боне Сфорца, яе герб і "эпікграма" на гэты герб. А ў канцы замест пасляслоўя... партрэт аўтара з надпісамі на трох мовах. Іншае тлумачэнне знайсці цяжка.

Тамара ШКУРКО.

Каляндар

Юбілейныя даты ў снежні

3 снежня — 95 гадоў з дня нараджэння беларускага пісьменніка Рыгора Казака (Рыгора Крушыны, 1908–1970), які жыў і памёр у ЗША.

4 снежня — 60 гадоў беларускаму паэту і перакладчыку Казіміру Камейшы.

6 снежня — 70 гадоў Зінаідзе Мажэйка, этнамузыколагу, доктару мастацтвазнаўства, заслужанаму дзеячу мастацтваў Беларусі, сябру ГА "МАБ".

7 снежня — 50 гадоў паэтэсе і літаратуразнаўцу, кандыдату філалагічных навук Любові Тарасюк, якая ўзначальвае суполку ГА "МАБ" на філалагічным факультэце БДУ.

19 снежня — 100 гадоў з дня нараджэння рускамоўнай пісьменніцы, заслужанай артысткі Грузіі Тамары Цулукідзе (1903–1991). Пасля ссылкі жыла ў Беларусі.

24 снежня — 205 гадоў з дня нараджэння польскага паэта, ураджэнца Навагрудчыны Адама Міцкевіча (1798–1855);

27 снежня — 80 гадоў з дня нараджэння паэта, кінасцэнарыста, заслужанага дзеяча культуры Беларусі Анатоля Вялюгіна (1923–1994).

Нам пішуць

ПОЛЬШЧА.

Шаноўная спадарыня рэдактар!

Як польскі сябар ГА «Міжнародная асацыяцыя беларусістаў», з вялікім задавальненнем і ўдзячнасцю я прачытаў у "Голасе Радзімы" № 44 за 30 кастрычніка 2003 года старонкі "Кантакты і дыялогі". Прафесар Адам Мальдзіс, старшыня ГА "МАБ", паведаміў нам, сябрам ГА "МАБ" за межамі Беларусі, аб дамоўленасці аб супрацоўніцтве з рэдакцыяй "Голасу Радзімы".

Я ўпэўнены, што, далучаючы да "Голасу Радзімы" галасы шматлікіх сяброў асацыяцыі, ГА "МАБ" паспрыяе пашырэнню "голасу Беларусі" ў свеце, паглыбленню ведаў чытачоў газеты пра надзённыя пытанні жыцця незалежнай, суверэннай Беларусі.

Карыстаючыся нагодай, спяшаюся падзякаваць спадарыні рэдактару за публікацыю ў "ГР" № 37 вершаў Рыгора Барадуліна да святой памяці Васіля Быкава ў Нямеччыне і ў златай Празе, дзе пісьменнік у свой час пражываў.

Усе гэтыя вершы прагучалі паралельна з арыгіналамі ў маім перакладзе на польскую мову ў эфіры беларускай службы Польскага радыё ў панядзелкі 13, 20, 27.X і з 3 да 10.XI у гэтым годзе.

У сувязі з гэтым звяртаюся з просьбай: ці мог бы я атрымаць ад Вас апошні прыжыццёвы здымак Васіля з Рыгорам, які быў апублікаваны разам з вершамі ў "ГР"? Марыцца мне кніжка вершаў на польскай, а мо і на дзвюх мовах. Здымак Сяргея Шапрана стаў бы ў кніжцы ўзрушальным дакументам творчага сяброўства двух вялікіх беларусаў.

Жадаю поспехаў "Голасу Радзімы" і Вам асабіста, спадарыня рэдактар.

Чэслаў СЕНЮХ.

Варшава, 12 лістапада 2003 г.

АД РЭДАКЦЫІ. Шаноўны спадар Сенюх, удзячныя вам за ўвагу да «Голасу Радзімы». У хуткім часе пастараемся выканаць вашу просьбу наконт фотаздымка. Жадаем вам паспяхова здзейсніць творчыя планы.

Памяць

Грынчыкаў кнігазбор

Ці думаў быценец Міхаіл Шклярык, які насіў мянушку Вецер, калі выбіраўся ў 1920-я гады на заробкі ў Нью-Йорк, што прывязе адтуль бібліятэку рускага графа? Чаму, жывучы з ашчаднасці ў бочцы, наборшчык амерыканскай друкарні патраціў заробак на кнігі? Як сталася, што пасля смерці Ветра яго кнігазбор, якім карысталіся многія быценцы, быў пушчаны амаль на вецер? Ці прадбачыў мясцовы бібліяфіл, што выратуе кнігі, перавезеныя ім з-за акіяна, ад поўнага знішчэння яго ж зямляк Мікалай Грынчык, імем якога назавуць адну з вуліц у тым жа Быцені?

Дзякуючы Грынчыку, мы ведаем пра няпросты чалавечы лёс аднаго з асветнікаў, жыццё якога працягваецца і сёння: яго кнігазборам карыстаюцца студэнты і выкладчыкі, пра яго расказваюць на экскурсіях, лекцыях у аддзеле рэдкай кнігі бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, дзе яны занялі пачэснае месца. Яшчэ пры жыцці, калі Мікалай Міхайлавіч працаваў загадчыкам кафедры беларускай мовы і літаратуры ў БДУ культуры, ім былі падараваны ў аддзел рэдкай кнігі бібліятэкі, які толькі пачалі ствараць, больш за 30 каштоўных выданняў. А прыватны кнігазбор, па словах Д.Ліхачова, — помнік, які адлюстроўвае асобу яе ўладальніка, яго веды, духоўныя практычныя патрэбы, нарэшце, проста манеру зносін з кнігай, манеру яе набываць, выкарыстоўваць, а іншы раз і разлучацца з ёю: дорачы, прадаючы, перадаючы, кідаючы або пакідаючы ў нядбайнасці?.. Бібліятэка ўтрымлівае ключ да разумення жыцця і дзейнасці ўладальніка.

Сёлета, калі М.Грынчыку споўнілася б 80 гадоў, яго жонкай Любоўю Аляксееўнай і сынам Мікалаем Мікалаевічам былі ахвяраваны ў аддзел рэдкай кнігі бібліятэкі БДУ культуры, дзе ўжо існуе асобная калекцыя кнігазбору прафесара, яшчэ каля 1 500 асобнікаў з яго бібліятэкі. Сярод гэтых кніг — 362 асобнікі з аўтографамі, падараваныя М.Грынчыку вядомымі беларускімі пісьменнікамі.

21 кастрычніка ў чытальнай зале бібліятэкі БДУ культуры адкрыта выстава "Бібліятэка М.Грынчыка", дзе экспануюцца не толькі цікавыя асобнікі з аўтографамі, але і такія рэдкія выданні, як "Дыялекталагічны атлас беларускай мовы" (Мн., 1963), "Беларускі народны арнамент" (Мн., 1953), "Fair Land of Byelorussia" (Анталогія сучаснай беларускай паэзіі на англійскай мове. М., 1976). На выставе размешчаны фотаздымкі з сямейнага архіва, а таксама здымкі, зробленыя ў час апошняй паездкі на радзіму Мікалая Міхайлавіча ў Быцень, якую арганізавалі супрацоўнікі аддзела рэдкай кнігі і выкладчыкі кафедры філалогіі БДУ культуры.

19 лістапада гэтага года ў БДУ культуры з шырокім удзелам беларусістаў, да якіх належаў і ён сам, адбыліся навуковыя чытанні "Грынчыкавымі сцежкамі", прысвечаныя 80-годдзю з дня нараджэння вядомага беларускага філолага.

Просім адгукнуцца ўсіх, хто ведаў М.Грынчыка, каму ёсць што сказаць пра яго як вучонага-філолага, выкладчыка і настаўніка, сябра і земляка, і прыслаць нам пра яго свае ўспаміны. Звяртайцеся ў аддзел рэдкай кнігі бібліятэкі БДУ культуры.

Лора ДОЎНАР,
галоўны бібліёграф аддзела рэдкай кнігі бібліятэкі БДУ культуры.

Меркаванне

Энцыклапедыя архіўнай Віцебшчыны

Калегі з Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы зрабілі беларусістам вельмі каштоўны падарунак – аб'ёмны фаліянт "Віцебшчына архіўная: гісторыя, фонды, персаналіі (сярэдзіна XIX – XX стст.)" (Мн., Віцебск, 2002).

Кнігу падрыхтавалі групы відных віцебскіх (М.Пішчулёнак, В.Шарэнда, В.Каханка, А.Далгова, В.Пашкевіч і інш.) і мінскіх (М.Шумейка, А.Галубовіч, Л.Лісава і інш.) архівістаў. Можна без перабольшання сказаць, што гэта унікальнае выданне, аналагаў якому, відаць, не існуе не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах. Па сутнасці гэта свайго роду энцыклапедыя, якая заключае ў сабе вельмі багаты даведачны і пазнавальны матэрыял, каштоўны для розных слаёў чытачоў — ад навуковых работнікаў, выкладчыкаў вышэйшых навучальных устаноў і настаўнікаў да вучняў школ.

Найперш прываблівае асноўная задума кнігі — паказаць архіўныя багацці Віцебшчыны, даць агульныя звесткі пра дакументы, якія звязаны з ёю і захоўваюцца не толькі ў самой вобласці, але і ва ўсёй Беларусі, расказаць пра гісторыю архіўнай справы і выдатных архівістаў паўночнага ўсходу краіны. Вядома ж, асобае месца займае ў выданні нарыс пра знакаміты Віцебскі цэнтральны архіў старажытных актавых кніг і яго, на жаль, драматычны лёс.

Ліквідаваны сто гадоў назад, у 1903 годзе, ён аказаўся вывезеным у Вільню, дзе быў зліты з Віленскім цэнтральным архівам старадаўніх актавых кніг, на зборы якога моцна паўплывалі трагічныя падзеі XX стагоддзя. Каштоўнейшай часткай кнігі, побач з яе гістарычным раздзелам, з'яўляюцца "агляды фондаў і пералікі дакументаў" пра Віцебшчыну, якія захоўваюцца ў дзяржаўных архівах Беларусі. Гэта Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, дзе знаходзіцца большая частка старажытных матэрыялаў, Нацыянальны гістарычны архіў у Гродне, Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, Беларускі архіў кінафотафонадакументаў, Беларускі архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі, а таксама дзяржаўныя архівы Віцебскай вобласці, у тым ліку абласны Дзяржаўны архіў, які налічвае больш аднаго мільёна адзінак захавання за 1917–2000 гады.

З вялікай любоўю да сваіх папярэднікаў у заключным, трэцім, раздзеле кнігі ("Архівісты і час") напісаны біяграфічныя нарысы пра людзей, якія прысвяцілі сваё жыццё станаўленню і развіццю архіўнай справы на Віцебшчыне. Сярод многіх імён ёсць як шырока вядомыя (А. Сазонаў, А. Сапуноў, Д. Даўгяла, М. Мялешка, А. Шлюбскі і інш.), так і тыя, чые імёны будуць увекавечаны дзякуючы працы сучасных даследчыкаў-архівістаў. Завяршаецца выданне цэлай серыяй розных хранікальных, дакументальных і даведачных дадаткаў, што яшчэ больш прыдае яму своеасаблівы энцыклапедычны выгляд.

Варта дадаць, што кніга нядрэнна выдадзена ў паліграфічных адносінах. Асабліва выйгрышна выглядае вокладка, на якой узноўлены старыя паштоўкі з відамі Віцебска. А вось тыраж гэтага вельмі цікавага і ўдалага ва ўсіх адносінах выдання, падрыхтаванага з вялікім стараннем, неверагодна малы — усяго 200 экземпляраў.

Юрый ЛАБЫНЦАЎ,
доктар філалагічных навук,
намеснік старшыні ГА "МАБ",

Ларыса ШЧАВІНСКАЯ,
кандыдат філалагічных навук.
(Масква).

Беларуская прысутнасць у свеце

Мікола ЧАБАН (Днепрапятроўск, Украіна).

"Я поволі по стежці пройду,* не стопчу я ногою й зерняти..."

У 2002 годзе зусім непрыкметна прайшло стагоддзе з дня нараджэння выдатнай украінскай паэтэсы Аксаны Лятурынскай, якая пакінула нам выдатныя ўзоры перакладаў з беларускай паэзіі.

... Каб спазнаць паэта, трэба, як кажуць, пабываць на яго радзіме. Мне пашчасціла: я не раз бываў на Валыні, якая дала ўкраінскай літаратуры А.Лятурынскую. Зямля Лесі Украінкі не магла не нараджаць паэтак. Аксана Міхайлаўна Лятурынская, паэтэса і мастачка, нарадзілася на заможным хутары на сучаснай Цярнопальшчыне. Гэта паміж Астрогам і Вішняўцом. Астрог — сталіца князёў Астрожскіх, якія мелі дачыненне і да Беларусі, сталіца ў многім супольнага кнігадрукавання. Хто хоць раз пабываў там, не забудзе гэтага замка — як крэпасці і як цвярдыні ўкраінскага духу. Вішнявец жа — роднае мястэчка князёў Вішнявецкіх (прыгадаем, што адна з Вішнявецкіх, Францішка Урсула, стала жонкай князя Радзівіла па мянушцы Рыбанька і заснавальніцай тэатра ў Нясвіжы). Калі я хадзіў па залах іх трохсотгадовага палаца, уяўляў, колькі разыгралася тут сцэн супольнай гісторыі.

А.Лятурынская нарадзілася на хутары Ліс, цяпер там сяло Хомы Збаражскага раёна. Бацька быў афіцэрам-пагранічнікам царскай арміі. Паходзіў ён са старажытнага французскага роду Лятур, які асеў на Украіне пасля 1812 года і даўно ўкраінізаваўся. Маці ж вяла свой радавод з сям'і нямецкіх каланістаў Верке. Аксана была самай малодшай з васьмі дзяцей. Лятурынскія жылі сярод прывабнай валынскай прыроды, якая аказала вялікі ўплыў на ўражлівую дзяўчынку, фармавала яе густ. У гады першай сусветнай вайны яна вучылася ў Астрозе, у жаночай гімназіі графіні Блудавай, дзе панавала руская мова. Я хадзіў па цёмных калідорах гэтай гімназіі. Яе памяшканне цяпер перададзена адроджанай Астрожскай акадэміі — самай старэйшай навучальнай установе ва Украіне.

З Астрога Аксана пераехала ў Крамянец — валынскія "Афіны", якія ў нашым уяўленні звязаны з імем класіка польскай паэзіі Юльюша Славацкага. Там яна вучылася ў пятым і шостым класах. Аглядаючы Крамянец з гары каралевы Боны, я бачыў і сцены той гімназіі.

У 1919 годзе памерла маці Аксаны, што стала для будучай паэтэсы цяжкім выпрабаваннем. Калі толькі дзяўчыне споўнілася васемнаццаць, бацька яе, чалавек цвёрдай рукі, рашыў выдаць дачку замуж за багатага, але нялюбага селяніна з суседняй вёскі Калодна. Аксана не магла змірыцца з гэтым і ўцякла з хутара да старэйшай сястры Антаніны, з яе дапамогай выехала ў Германію, дзе знаходзіўся старэйшы брат Іван. А неўзабаве перабралася ў Прагу. Там зблізілася з вядомымі ўкраінскімі паэтамі Аленай Тэлігай, Алегам Ольжычам, Яўгенам Маланюком — прадстаўнікамі "пражскай школы" ва ўкраінскай паэзіі.

У Празе А.Лятурынская здала экзамены за гімназію, наведвала лекцыі па літаратуры, філасофіі і мастацтву ў Карлавым універсітэце (прыгадаем, што тады там займалася многа беларускіх студэнтаў), вучылася ў Вышэйшай мастацка-прамысловай школе і Украінскай студыі пластычнага мастацтва, брала ўрокі малявання ў вядомых прафесараў С.Мако і М.Дворжака. Пачала друкавацца ва ўкраінскім часопісе "Вісник". Вершы яе вызначаліся сімвалізмам, дакладнасцю слова. У творчасці Лятурынскай пераважалі гістарычныя і міфічныя тэмы. У Празе выйшаў першы яе паэтычны зборнік "Гусла" (1938), цёпла сустрэты крытыкай. Потым з'явіўся другі зборнік "Княжа емаль" (1941), дзе выявіліся вытанчанасць стылю, увага да народна-абрадавай паэзіі. Гэтая кніжка была перавыдадзена ў 1955 годзе ў Таронта (Канада) з дадаткам падборкі "Веселка". Прадмову да кнігі напісаў Яўген Маланюк, які назваў аўтара "адной з самых яскравых жанчын рускіх нашай паэзіі".

У 1946 годзе ў Мюнхене выйшаў зборнік яе навел "Материнки" пад псеўданімам Раксана Вішнявецкая (напэўна, згадаўся Вішнявец). У зборнік "Бедрык" увайшлі вершы для дзяцей. У 1949 годзе паэтэса пераехала ў Мінеаполіс (ЗША), дзе правяла звыш дваццаці гадоў. Стала вядомай як аўтар скульптурных партрэтаў Т.Шаўчэнкі і іншых украінскіх дзеячаў. У Амерыцы распісвала яйкі-пісанкі, стварыла серыю лялек-мадэлей, мноства керамічных твораў. Асабістае жыццё паэтэсы не склалася. Да таго ж яна аглухла, і гэта ўскладніла яе сувязі са светам. А.Лятурынская памерла 13 чэрвеня 1970 года ў Мінеаполісе і пахавана ў Баўнд-Бруку.

Аксана Лятурынская пераклала на ўкраінскую мову шэраг вершаў Максіма Багдановіча — "Так тепло цілий день було", "От сонце надвечір мережі затче", "Агата". Яна ж пераўвасобіла па-ўкраінску вершы Ларысы Геніюш — "Уночі", "Не боюся", "Килими", "Над річкою". "Калисьці". Перакладаў было значна больш, але падзеі вайны не садзейнічалі іх захаванню.

**Артыкул друкуецца ў скарачэнні.*

Дыяспара і культура

Англійскі беларусіст Арнольд Макмілін пераказаў у рэдакцыю "Голасу Радзімы" кнігу "Роля беларускай дыяспары ў захаваньні і разьвіцьці беларускай культуры = The Role of the Belarusian Diaspora in Preserving and Developing Belarusian Culture", выдадзеную Бібліятэкай і музеем імя Францішка Скарыны ў Лондане ў 2003 годзе. У гэты зборнік ўвайшлі матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, якая адбылася ў Лондане ў верасні 2001 года. Шырока прадстаўлены ў кнізе артыкулы сяброў Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў.

Зборнік адкрывае артыкул прафесара Арнольда Макміліна, у якім характарызуюцца адносіны дыяспары да спадчыны Францішка Скарыны. У зборнік увайшло некалькі артыкулаў агульнага характару, дзе прааналізавана дзейнасць навуковых і культурных цэнтраў беларускай дыяспары і іх уклад у развіццё беларускай культуры як у памежных краінах (Расійская Федэрацыя, Польшча, Літва), так і ў далёкім замежжы (ЗША, Канада, Вялікабрытанія, Францыя), акрэслена роля дыяспары ў захаванні і развіцці беларускай мовы.

Багата старонак у зборніку прысвечана эміграцкай мастацкай літаратуры — найпершай выразніцы нацыянальнай самасвядомасці. Тут і англамоўны артыкул паэтэсы і перакладчыцы Веры Рыч пра паэзію дыяспары (праблемы яе вяртання з забыцця, спалучэння ў ёй традыцыйнай тэматыкі з новымі формамі) і грунтоўнае даследаванне канцэпцыі нацыянальнага быцця ў прозе беларускіх эмігрантаў XX стагоддзя Алеся Пашкевіча, цяпер старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў, і развагі пра пераклады эміграцыі Лявона Юрэвіча з Нью-Йорка. Марыя Міцкевіч, унучка народнага песняра, разгледзела праблему "Якуб Колас на Захадзе".

У кнізе прадстаўлены і артыкулы прадстаўнікоў беларускай дыяспары ў другім і трэцім пакаленнях Вірджыніі Шыманец (Парыж) і Марыі Паўлы Сурвіллы, выкладчыцы Вартбургскага каледжа ў Уэйвэрлі (ЗША). Першая з іх разглядае прынцыпы, на якіх склалася "французская школа беларусазнаўства" з яе квартальнікам і даволі багатай колькасцю кніжных выданняў. М.-П.Сурвілла, даследчыца ўзаемадзеянняў традыцыйных і сучасных жанраў у беларускай музыцы, паказвае, як адбываецца ідэнтыфікацыя і самаідэнтыфікацыя маладой часткі беларускай дыяспары ў Паўночнай Амерыцы.

Марына Язьневіч (Мінск) прывяла красамоўныя прыклады, якія сведчаць, што беларуская дыяспара Вялікабрытаніі аказвае вялікую дапамогу ў аздараўленні дзяцей з абласцей, дзе выявіліся наступствы аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Трэба адзначыць, што некаторыя матэрыялы лонданскай навуковай канферэнцыі былі апублікаваны ў спецыяльным нумары "Кантактаў і дыялогаў", калі яны выходзілі асобным бюлетэнем (2002. № 3–4).

Іна ЖАРКЕВІЧ,
студэнтка факультэта міжнародных адносін БДУ.

Хроніка падзей

Нас наведалі...

*... **Вера НОВІК**,* выкладчыца Марыйскага дзяржаўнага універсітэта (Расійская Федэрацыя). Актыўная ўдзельніца кангрэсаў ГА "МАБ", яна цяпер працуе над кнігай пра сваю родную вёску Малая Воля Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці, шукае адпаведныя архіўныя матэрыялы. Наладжвае кантакты з марыйскай дыяспарай у Беларусі.

*... **Рышард РАДЗІК,*** намеснік дэкана факультэта сацыялогіі Люблінскага універсітэта імя Марыі Кюры-Складоўскай, сябар камітэта ГА "МАБ". Гаворка з ім вялася пра тэматыку будучага кангрэса беларусістаў, падпіску на газету "Голас Радзімы", у якой змяшчаюцца старонкі "Кантакты і дыялогі".

Чацвёртыя Доўнараўскія чытанні

У Рэчыцы адбыліся чарговыя, чацвёртыя Міжнародныя чытанні, прысвечаныя памяці і спадчыне беларускага, рускага і ўкраінскага гісторыка Мітрафана Доўнар-Запольскага.

Побач з беларускімі даследчыкамі ў чытаннях прынялі ўдзел госці з суседніх краін. Расійскую Федэрацыю прадстаўлялі доктар філалагічных навук Аляксей Каўка (Масква) і доктар гістарычных навук Сяргей Міхальчанка (Бранск). З Польшчы прыехала Дарота Міхалюк (Торунь). Найбольш прадстаўнічай была кіеўская дэлегацыя, куды ўваходзілі дактары навук Ігар Вярба, Васіль Ульяноўскі, Ірына Мацяш. Як заўсёды, актыўна ўдзельнічаў у сумесным абмеркаванні прафесар Кіева-Магілянскай акадэміі Юры Мыцык (на здымку).

Па матэрыялах папярэдніх чытанняў ужо выдадзены два зборнікі матэрыялаў, рыхтуецца трэці. У рамках сумеснай праграмы пабачыла свет "Гісторыя Беларусі" М. Доўнар-Запольскага.

Тэкст і фота **Віталя СКАЛАБАНА,** кандыдата гістарычных навук.

Кнігі, якія нам паступілі

Мельнікава З. П. БЕЛАРУСКАЕ ГІСТОРЫКА-ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЕ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА. Брэст, 2003.

Станаўленне гістарызму ў беларускім літаратуразнаўстве прасочваецца на прыкладзе твораў 20–30-х гадоў XX стагоддзя.

Санина Инна. РОДНИКИ: СТИХОТВОРЕНИЯ И ПОЭМЫ. Лос-Анджелес, 2002.

Трэці паэтычны зборнік мінчанкі, архітэктара па прафесіі, якая цяпер жыве ў ЗША.

Содаль Уладзімір. УМЕЙ СЛУХАЦЬ: КУШЛЯНСКІЯ ДЫЯМЕНТЫ-ЖАРТОЎКІ, АНЕКДОТЫ, АПОВЕДЫ, ДОСЦІПЫ. Мн., 2003.

Своеасаблівая анталогія гумару тых мясцін, дзе жыў Францішак Багушэвіч.

Улащик Н. Н. ДЕРЕВНЯ ВИЦКОВЩИНА. 1880-1917 ГГ. ВОСПОМИНАНИЯ О НИКОЛАЕ УЛАЩИКЕ. М., 2003.

У кнігу вядомага беларускага гісторыка, які жыў і працаваў у Маскве, увайшлі нарыс пра яго родную вёску, што знаходзіцца пад Мінскам, успаміны маскоўскіх, мінскіх і кіеўскіх калег. Прадмову напісаў маскоўскі беларусіст Аляксей Каўка.

Художественный текст: ВОСПРИЯТИЕ. АНАЛИЗ. ИНТЕРПРЕТАЦИЯ. Вильнюс, 2003.

У зборніку, выдадзеным на літоўскай і рускай мовах, змешчаны артыкул прафесара Беларускага дзяржаўнага універсітэта Таццяны Камароўскай "Мы — іншыя: Пра сучасную англамоўную феміністычную прозу" (с. 313–321).

Валянціна ГРЫШКЕВІЧ.

Ад нас адышлі

Віктар Дарашкевіч

Са спазненнем з Гродзеншчыны прыйшла сумная вестка: 12 кастрычніка ў Казлоўшчыне Дзятлаўскага раёна трагічна загінуў у час пажару літаратуразнавец-тэкстолаг, перакладчык, крытык Віктар Дарашкевіч. З яго імем звязана публікацыя беларускага перакладу "Песні пра зубра" Міколы Гусоўскага.

В. Дарашкевіч нарадзіўся 9 чэрвеня 1949 года ў вёсцы Цёмнае Балота (цяпер Сасновы Бор) Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і калгасніка. Закончыў Астрынскую сярэднюю школу і філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Вывучаў класічную філалогію ў аспірантуры Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў у Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР і ў прэзідыуме Акадэміі навук. З удзелам В. Дарашкевіча была распрацавана вялікая праграма па святкаванні 500-годдзя з часу нараджэння Францішка Скарыны. Для гэтай жа праграмы ён склаў зборнік матэрыялаў і дакументаў пра жыццё і дзейнасць беларускага першадрукара (1988).

В. Дарашкевіч – аўтар даследавання "Новалацінская паэзія Беларусі і Літвы: Першая палова XV ст." (Мн., 1979). Напісаў пасляслоўе, каментары і склаў бібліяграфію для беларускага перакладу "Песні пра зубра" Міколы Гусоўскага (Мн., 1980). Публікаваўся ў англамоўных выданнях ЮНЕСКА.

Памяць пра В. Дарашкевіча, аднаго з нешматлікіх нашых лацініст аў, застанецца ў гісторыі беларускага літаратуразнаўства.

Вячаслаў ЧАМЯРЫЦКІ,
загадчык аддзела Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы НАНБ.

выстава

ЗЕМЛЯКАМ ПРА ДАЛЁКІ УСХОД

Анатоль Сяргееў нарадзіўся ў 1944 годзе ў Мар'інай Горцы, што на Мiншчыне. Тут скончыў школу, а затым лёс закінуў яго ў Магадан, дзе 15 гадоў працаваў фармоўшчыкам-бетоншчыкам на заводзе буйнапанельнага домабудавання.

20 гадоў назад пачаў фатаграфаваць, друкаваўся ў газетах "Магаданская правда", "Сельская жизнь", часопісах "Дальний Восток", "Ровесник", "Собеседник", "Советская женщина", удзельнічаў ва ўсесаюзных і міжнародных выставах. Захапленне стала прафесіяй. Анатоль Рыгоравіч зараз узначальвае... узначальвае — ходзіць у мастацкі савет фотастудыі "Магадан", з'яўляецца сябрам Саюза фотамастакоў Расіі. Пабываўшы нядаўна ў Мар'інай Горцы, пакінуў землякам сваю выставу пейзажных фатаграфій "Нябеснае святло", у якой — прыгажосць і загадкавасць прыроды таго далёкага краю, дзе ён зараз жыве. Работы Сяргеева вядомыя на Беларусі: у розных выданнях змешчана каля 500 яго фатаграфій.

Рэгіна ГАМЗОВІЧ.

НА ЗДЫМКАХ: Анатоль СЯРГЕЕЎ; "Калымскі ліпень у дождж" (фота з выставы).



весткі з суполак

МАЛДОВА

ПАМЯЦІ УЛАДЗІМІРА АКУШКІ

Напрыканцы кастрычніка бягучага года на будынку мастацкага каледжа імя А.Пламадзяла была адкрыта мемарыяльная дошка ў гонар заснавальніка школы мастацтва, выдатнага мастака, таленавітага педагога Уладзіміра Акушкі (1862-1919).

Мастак жыў і працаваў у Кішынёве з 1897 па 1919 год. Шмат зрабіў для развіцця мастацтва ў Бесарабіі. Беларус У.Акушка быў ініцыятарам стварэння музея і будаўніцтва памяшкання для яго, аўтарам рэарганізацыі школы малявання ў мастацкае вучылішча. Яно было адкрыта ў снежні 1918 года і доўгі час насіла імя вялікага рускага мастака І.Рэпіна. Першым дырэктарам вучылішча стаў А.Пламадзял, скульптар, аўтар помніка Стэфану Вялікаму ў Кішынёве.

Зробленае прымэрыяй і муніцыяй горада, Пасольствам Беларусі ў Малдове — добры знак. Тут памятаюць і шануюць людзей, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё гэтага цудоўнага краю.

Вячаслаў ІГНАЦЕНКА.

прэзентацыя

ПЕРШЫ «ШАГАЛАЎСКІ МІЖНАРОДНЫ ШТОГОДНІК»

Прэзентацыя першага выпуску "Шагалаўскага міжнароднага штогодніка", у які ўвайшлі публікацыі мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў, архівістаў, калекцыянераў і журналістаў з Беларусі, Расіі, Германіі, ЗША, Ізраіля, адбылася ў Віцебску. Усяго ў выданні прадстаўлена 30 матэрыялаў больш як 20 аўтараў.

НА ЗДЫМКУ: выступае адзін з аўтараў новага выдання мастацтвазнаўца, дацэнт Віцебскага дзяржаўнага універсітэта Аляксандр ЛІСАЎ.

Фота **Аляксандра ХІТРОВА,** БелТА.

сітуацыя

ЧЫКАГА, ЗША

У 1978 годзе ў Чыкага ўзведзены помнік нацыянальнаму герою Беларусі, Польшчы, Францыі і ЗША Тадэвушу Касцюшку. Конная скульптура Тадэвуша Касцюшкі ў цэнтры Чыкага з'явілася з ініцыятывы польскай дыяспары. Але сярод мноства надпісаў на пастаменце нават няма згадкі пра беларускае паходжанне Касцюшкі. На велічным манументе сярод пералікаў вайсковых заслуг генерала па-польску напісана: "Вялікаму грамадзяніну Польшчы і ЗША". Ні слова пра тое, што Касцюшка беларус, што нарадзіўся ён на Берасцейшчыне, што неаднойчы вяртаўся на Радзіму і жыў тут. Амерыканскія палякі не пазначылі на пастаменце, што паўстанне 1794 года, якое ён узначаліў, было нацыянальна-вызваленчым аднолькава як для палякаў, так і беларусаў. І што самы дзейны ўдзел бралі ў ім беларусы. Спробы прадстаўнікоў беларускай дыяспары ў Чыкага аднавіць гістарычную раўнавагу аказаліся пакуль марнымі.

"Беларускі дайджэст". 2003, верасень.

ГРАНТ З ЗША НА АДРАДЖЭННЕ СЯДЗІБЫ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ ПАСТУПІЎ НА РАХУНАК ІВАЦЭВІЦКАГА РАЙВЫКАНКАМА

Грант з ЗША ў памеры 28 тысяч 281 долар на адраджэнне сядзібы Тадэвуша Касцюшкі ва ўрочышчы Мерачоўшчына паступіў на спецыяльны рахунак Івацэвіцкага райвыканкама.

Такую інфармацыю паведамілі ва ўпраўленні культуры Брэсцкага аблвыканкама. Гэтыя грошы былі выдзелены па пагадненні, якое заключылі паміж сабой абласное ўпраўленне культуры і Пасольства ЗША ў Беларусі. Прычым, у практыцы апошняга гэта першы выпадак выдзялення гранта дзяржаўнай установе. Амерыканская фінансавая дапамога будзе скарыстана на аднаўленне знешніх і ўнутраных сцен сядзібы.

Рашэнне аб аднаўленні радавога гнязда кіраўніка нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 года беларуса Тадэвуша Касцюшкі — нацыянальнага героя ЗША і Польшчы, ганаровага грамадзяніна Францыі, было прынята ў канцы 2002 года Брэсцкім аблвыканкамам. Асноўныя работы ў Мерачоўшчыне павінны быць выкананы да сярэдзіны 2004 года. Агульны кошт работ папярэдне ацэнены ў 112,5 тысячы амерыканскіх долараў. Чакаецца, што частка сродкаў будзе выдзелена з абласнога бюджэту, а таксама фінансавую дапамогу акажуць краіны, як гэта ўжо зрабілі ЗША, з якімі звязана гераічная біяграфія нашага праслаўленага земляка. Рэстаўрацыйныя работы ўжо пачаліся летам, калі на месцы сядзібы былі праведзены раскопкі. У ходзе іх былі знойдзены падмурак жылых і гаспадарчых пабудоў, нямала прадметаў быту, якія маюць гістарычную каштоўнасць і могуць стаць экспанатамі будучага музея.

Іван КУКСО, БелТА.

зваротная сувязь: аргенціна

Эдуарда ПЕНІСІ, *кіраўнік хору "Купалінка", адвакат.*

«ЯК Я ЗАХАПІЎСЯ БЕЛАРУССЮ...»

Беларуска-ўкраінская злучнасць у Льявальёлі існуе ўжо больш за паўстагоддзя. У 1942 годзе было створана першае культурнае аб'яднанне, названае "Аб'яднанне беларусаў і ўкраінцаў Льявальёля". Сябры таго таварыства збіраліся ў нанятым памяшканні, таму ў іх бракавала прастору для дужа шырокай дзейнасці. Ад самага пачатку быў наладжаны збор сродкаў на набыццё нерухомасці вялікіх памераў. Такім чынам, толькі ў 1952 годзе таварыству ўдалося купіць два зямельныя ўчасткі на вуліцы Дуальдэ. У тым самым годзе быў заснаваны Культурна-спартыўны клуб імя Аляксея Талстога, які ў 1969 годзе быў перайменаваны ў Культурна-спартыўны клуб "Дняпро".

Я стаў сябрам клуба праз шэсць гадоў, калі мне толькі споўнілася 15, вучыўся нацыянальным танцам і рускай мове. У клуб мяне прывялі сябры. Льявальёль — гэта вялікая калонія нашчадкаў беларускіх і ўкраінскіх імігрантаў. З цягам часу я пачаў усё больш цікавіцца славянскай культурай. У тую пару я ўжо прафесійна іграў на акардэоне, пад які танцавалі і спявалі ў клубе. Маё веданне мовы і музычная падрыхтоўка, а пасля і вывучэнне спеваў спрычыніліся да таго, што неўзабаве я заняўся арганізацыяй спеўных груп. Я спяваў у шэрагу хароў, а ў 1981 годзе стаў кіраўніком танцавальнага калектыву. Танцы і спевы ішлі поруч.

Знамянальным годам у маім жыцці стаў 1988-мы, калі па запрашэнні Беларускага таварыства "Радзіма" наведаў Савецкі Саюз і атрымаў магчымасць пазнаёміцца з дзейнасцю найлепшых і найвыбітнейшых танцавальных і спеўных калектываў таго часу. У мяне была месячная стажыроўка ў горадзе Мінску, дзе я вучыўся танцам і спевам і ўпершыню сутыкнуўся з беларускай народнай культурай.

Тут, у Буэнас-Айрэсе, найбольш слынным з'яўляецца рускае фальклорнае мастацтва, бо рускія народныя калектывы існуюць у Аргенціне шмат гадоў. У нашай супольнасці больш вядомым быў украінскі фальклор. Беларуская ж культура падпала пад вялікі ўплыў іншых народнасцей. У нас не было магчымасці пазнаёміцца з аўтэнтычным беларускім матэрыялам.

Але пасля таго падарожжа ў Мінск у мяне расплюшчыліся вочы. Адкрылася багацце і неабсяжнасць беларускага фальклорнага мастацтва. Ад таго часу я стаў працаваць над тым, што вучыў у Мінску, заснаваўшы ў рамках нашай супольнасці нешта цалкам новае і непаўторнае. Я стажыраваўся ў Мінску ў маі 1988 года, а ўжо 20 чэрвеня таго самага года ў нашым клубе быў заснаваны хор "Купалінка". Яго рэпертуар складаўся з беларускіх, рускіх і ўкраінскіх песень. У рабоце хору бралі ўдзел больш за 20 чалавек.

Пасля распаду СССР і перыяду крызісу ў 1998 годзе я зноў атрымаў запрашэнне наведаць Мінск. Гэтым разам курс маёй падрыхтоўкі ўключаў вывучэнне беларускіх танцаў, спеваў, тэатральнага мастацтва, гісторыі, геаграфіі, звычаяў і традыцый. Стажыроўка працягвалася 23 дні. З таго часу я прысвяціў сябе выключна беларускім музыцы і спевам. Мы пачалі ставіць фальклорныя спектаклі працягласцю 45 хвілін, якія былі вельмі папулярнымі і пра якія часта згадваюць дагэтуль.

У 2000 годзе я зноў наведаў Беларусь, і гэта было самае вялікае дасягненне ў маім прафесійным жыцці: у мяне з'явілася магчымасць на працягу месяца вучыцца ў Беларускім універсітэце культуры пад кіраўніцтвам Станіслава Дробыша. Нам выкладалі тэатральную рэжысуру, мастацтва кіравання хорам, адточвалі наша музычнае і спеўнае майстэрства. З таго часу рэпертуар нашай "Купалінкі" на 80 працэнтаў складаецца з беларускіх песень, на 20 працэнтаў — з украінскіх і рускіх. Можна сказаць, што наш гурт — гэта, несумненна, беларускі фальклорны калектыў з выразнымі формамі, стылем і мастацкай эстэтыкай. Вынікам нашай сумеснай працы стала выданне ў 2002 годзе касеты з запісамі 12 песень у выкананні нашага ансамбля.

Ужо амаль трыццаць гадоў я ўдзельнічаю ў жыцці нашай грамады і магу запэўніць: нягледзячы на тое, што я аргенцінец ад нараджэння, Беларусь з'яўляецца маёй другой радзімай. Я спаталяў сваю прагу да прыгожага мастацтва з беларускай крыніцы,таму магу лічыць сябе сапраўдным беларусам. Ступаючы на беларускую зямлю, адчуваю сябе ва ўласным доме, сярод родных людзей. Дастаткова добра размаўляю на мове, мяне натхняе беларускае мастацтва. Мы не аргенцінцы, што ствараюць ва ўлонні беларускай культуры, мы — амаль беларусы, якія, як гэта можна заўважыць, прысвяцілі сябе сваёй роднай справе.

Я мару калі-небудзь зноў прыехаць на курсы, што ладзіць таварыства «Радзіма», каб паглыбіць свае веды. Эканамічная сітуацыя ў Аргенціне істотна змянілася, цяпер вельмі цяжка выехаць у замежжа, але я не губляю надзеі вярнуцца калісьці ў Беларусь, якою я так апантаны.

Пераклад Анатоля ПРАСАЛОВІЧА, аспіранта МДЛУ.

госць

РЫЦАР ПЯЦІБОР'Я

НА ВЫШЭЙШУЮ ПРЫСТУПКУ П'ЕДЭСТАЛА ГОНАРУ АПОШНЯГА ЮНІЁРСКАГА ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ Ў АФІНАХ УЗЫШОЎ ПРАДСТАЎНІК БЕЛАРУСІ, СТУДЭНТ МІХАІЛ ПРАКАПЕНКА — НАША АЛІМПІЙСКАЯ НАДЗЕЯ

– Міхаіл, тытул чэмпіёна свету ў асабістым першынстве – выдатная "ўверцюра" перад Алімпійскімі гульнямі, якія пройдуць таксама ў Афінах. Хацелася б з першых вуснаў даведацца пра перамогу беларускага супермена.

— Сапраўды, я задаволены сваім вынікам, тым больш, што адчуваў дадатковы груз адказнасці: летам выйграў еўрапейскае першынство сярод аднагодкаў. Гэта абавязвала падняцца на новую прыступку і, адпаведна, пацвердзіць невыпадковасць перамогі.

Я адразу ж паказаў свой вынік у стральбе. Ні вышэй, ні ніжэй, менавіта той, на які быў гатовы ў працэсе трэніровак. З 20 выстралаў набраў 181 ачко.

– Але чаму менавіта пяцібор'е і каму больш за ўсіх абавязаны сваімі поспехамі?

— Мой бацька, Віктар Мікалаевіч, сістэматычна бегаў на 3–5 кіламетраў, а па выхадных займаўся ў спартыўнай зале і браў мяне з сабой. Як сапраўдны афіцэр, ён разумее значэнне фізкультуры не толькі для фізічнага развіцця, але і для замацавання такіх каштоўных якасцей характару, як адказнасць, дысцыпліна і самаарганізаванасць. Бацька ўплываў на мяне асабістым прыкладам. Наогул, я веру, што пяцібор'е — "каралева спорту" — у недалёкай будучыні стане такім жа папулярным, як і біятлон. Гэты універсальны від таго заслугоўвае.

– Пасля ціра вас чакала 31 дуэль у фехтаванні з наймацнейшымі пяціборцамі свету...

— Гэта стандартны варыянт на такіх спаборніцтвах. На фехтаванні я прайграў толькі 7 баёў. Сапраўды ўдалося нават больш, чым спадзяваўся. З французам (С.Пла) мы набралі аднолькавую колькасць ачкоў — 1 056, але ў асабістай сустрэчы я выйграў у яго. Ад бліжэйшых канкурэнтаў з'явіўся разрыў 56 і 84 ачкі. Ужо пасля двух відаў пачаў лідзіраваць і выйшаў на першае месца. Гэта быў выніковы задзел, і да самага канца я ўжо не выпускаў лідэрства.

– Рэдка бывае, каб падобныя спаборніцтвы праходзілі без сучка і задзірынкі. А як на гэты раз праявіліся судзейскія настроі?

— Сапраўды, без гэтага не абышлося. Перад выхадам на конную жараб'ёўку мы з французам пасля трох відаў мелі аднолькавую суму ачкоў — 3 400. Але чамусьці суддзі паставілі француза першым, хоць па ўсіх правілах павінны былі паставіць мяне. Трэнер Анатоль Ткачэнка папярэдзіў мяне, што будзе настойваць на выпраўленні памылкі ў тэхнічных дэлегатаў. Але я адмовіўся. Разумеў, што ўсё роўна ўся Еўропа будзе «хварэць» за Францыю. А пра сябе падумаў, што гэта дадасць мне спартыўнай злосці. У выніку пераадолеў маршрут чыста, ад кантрольнага часу адхіліўся толькі на секунду. Быў вельмі задаволены вынікам і ў знак удзячнасці не толькі пакудлаціў грыву, але і пацалаваў каня.

Пасля чатырох відаў усе зразумелі, што ніякай выпадковасці адбыцца не можа. Бо лёгкаатлетычны крос — гэта мой каронны від, у якім практычна заўсёды выйграваў. А тут з запасам 28 секунд на 3 000 метраў — сам Бог загадаў. Так што можна было асабліва не напружвацца, аднак давялося змагацца на дыстанцыі за камандную "бронзу". Было ўжо ясна, што "золата" возьме Расія, "серабро" — Карэя, а трэцяе месца нам неабходна было адваёўваць. Апошнія 30 метраў фінішаваў са сцягам Беларусі.

– Ну і некалькі слоў пра сваю запаветную мару.

— Вельмі хачу трапіць на Алімпійскія гульні 2004 года.

Жадаючы Міхаілу Пракапенку алімпійскай перамогі, успомніў словы галоўнага трэнера Анатоля Ткачэнкі: «Міхаіл створаны для вялікага спорту: чым вышэйшы ранг спаборніцтваў, тым больш упэўнена ён выступае».

Тэкст і фота **Мікалая ЛЯБЕДЗІКА.**

ДАВЕДКА. Беларусь па пяцібор'і ўваходзіць у шасцёрку сусветных лідэраў сярод мужчын, а сярод моладзі – у тройку. Беларусы-пяціборцы – чэмпіёны свету: 1988 – Сяргей Герасімовіч, 1993 – Сяргей Коршун, 1996 – Жанна Шубянок, 2003 – Міхаіл Пракапенка.

паэтычная імпрэза

Андрэй ГАЙСА

Каханай

Цудоўны вечар ігліцай
Напоўніў прастору.
Белыя, быццам снег, бярозы
Спяваюць хорам.
З нябёсаў цікуе месяц
За грэшнай зямлёю.
Я зараз вельмі шкадую,
Што не з табою...

Дзіўны сон

Мне сніўся сон,
што голас мой пачуты,
І у бясконцай неабдымнай мгле
Зышлі з нябёс анёлы,
быццам зоркі,
Каб паказаць дарогу да цябе.
– О, Госпадзі,
нашто мяне пакінуў
На гэтай акрываўленай зямлі?
Я моцна крыкнуў,
працягнуў далоні,
І ў Боскі рай яны мяне ўзнялі.
Мне сніўся сон,
што голас мой пачуты,
Ад шчасця нават плакала душа.
Калі прачнуўся –
усё вакол нязменна.
Выходзіць, сны не вартыя
граша!

Кругавід

Пройдзе час,
і я раздам
непатрэбныя болей рэчы:
зямлі – цела,

Малюнак Вячаслава ІГНАЦЕНКІ.

вадзе – кроў,
дрэвам – каханне,
агню – волю,
і тады ў мяне
застанецца
толькі яна –
мая бессмяротная душа.

Поўнач

Я не люблю за тое поўнач,
Што застаюцца справы,
Справы, якія не паспеў зрабіць.

Я не люблю за тое поўнач,
Што засынаюць словы,
Словы, якія не паспеў сказаць.

Я не люблю за тое поўнач,
Што паміраюць мары,
Мары, якія не паспеў здзейсніць.

знаходкі

ЛОНДАНСКАЯ ЗАГАДКА

Дзятлаўскі пяцікласнік Дзіма Пігульскі нядаўна знайшоў у рэчцы, ля гарадскога рынку, незвычайную цагліну. Яго ўважлівы позірк прыцягнуў надпіс на ёй: "London". Дарэчы, Дзіма захапляецца не толькі англійскай мовай, але і гісторыяй. Як бачна, гэта яму спатрэбілася.

Узнікае пытанне: якую мясцовую тэхналогію і якога стагоддзя абслугоўвала імпартная брытанская цэгла? Наколькі была лепшай за мясцовую ў краі, багатым на прыродную гліну?

Археолаг Пётр Русаў, які больш за дзесяць гадоў праводзіць на Дзятлаўшчыне раскопкі, выказаў думку, што гэта цагліна вельмі моцная, вогнетрывалая.

Але для чаго была прызначана? Калі трапіла ў Дзятлава?

Знаходка Дзімы Пігульскага ўключана ў фонд мясцовага краязнаўчага музея.

Іосіф ЗАЯЦ.

захавай традыцыю

СТРАВЫ Ў ПОСТ

28 лістапада ў праваслаўных беларусаў пачынаецца шасцітыднёвы перадкалядны, або Піліпаўскі, пост, Піліпаўка. Людзі старэйшага пакалення ўспамінаюць, што ў Піліпаўскі пост елі шмат смачнага. І хоць традыцыйна харчаванне беларусаў у гэту пару складалася найбольш з хлеба і бульбы, але да іх дадавалася шмат гародніны і каш, грыбоў і ягад, таму, калі гаспадыня была "з выдумкай", то сям'я спажывала сапраўды разнастайныя стравы. Калі дадаць яшчэ, што да посту білі (ці здабывалі з дапамогай самаробных ціскоў) алеі "для акрасы" з канаплянага і льнянога семені, то атрымліваецца багатае на вітаміны, карыснае для здароўя меню.

***

Кацярына БЛОЦКАЯ з вёскі Буразь Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці ўспамінае, што ў Піліпаўскі пост яе маці заўсёды гатавала наступныя стравы:

КВАША

Спачатку рабілі СОЛАД з жытняй мукі: 2 жмені мукі сыплюць у трохлітровы чыгунок, туды наліваюць цёплай вады і размешваюць да гушчыні смятаны, затым ставяць на печы (у цёплае месца) на ноч, каб перабрадзіў. Раніцай у такі ж трохлітровы чыгунок накладаюць да паловы ягады КАЛІНЫ, заліваюць іх кіпенем, каб добра распарыліся, затым дадаюць туды солад і ставяць у печ. Хутка страва робіцца, як кісель, яна кісла-салодкая на смак. Калі не было каліны, то квашу варылі з сухіх яблыкаў і груш-дзічак. Елі з хлебам і проста так.

МАЧАНКА З МАКУ

Распарвалі нанач кіпенем мак, а раніцай расціралі яго з цукрам. Мачалі ў мак прэсныя коржыкі або хлеб і елі.

ПАЛЕНІК

Расчынялі мучное цеста на вадзе і распарвалі хмель заместа дражджэй. Такое цеста брадзіла ноч і дзень, а праз суткі дадавалі ў яго прасеянай пшанічнай мукі і мясілі, як на хлеб. Пяклі на патэльні перад полымем.

***

Наступныя стравы запісаны дыялектолагам Іванам ЯШКІНЫМ.

ЮШКА (ГРЫБНАЯ ПОЛІЎКА)

З вечара ўчыняецца рашчына (вадкае цеста) з жытняй мукі на цёплай вадзе ў невялічкай дзежачцы, якая ставіцца ў цёплае месца (звычайна на лянуху — выступ, на які наступаюць, каб узлезці на печ). Калі ўчыняць рашчыну не ў дзежцы, а ў іншай пасудзіне, то дадаваць у вадкае цеста сыраквашы. Раніцай сушаныя грыбы (лепш баравікі) перамыць, парэзаць і прыварыць, потым дадаваць рашчыну і памешваць, каб не было камячкоў, пасаліць па смаку і ўкрышыць галоўку цыбулі. Падаваць у місе. Ядуць поліўку з хлебам або адваранай бульбай.

(З вёсак Старынкі і Саламір'е Полацкага раёна).

Такую поліўку ядуць паўсюдна на Беларусі і зараз. Раней абавязкова — у пост, у Чысты Чацвер перад Вялікаднем, на трэцюю каляду перад Вадохрышчам, у Дзеда ву пятніцу і кожную пятніцу ўвогуле, калі год быў грыбны *(так кажуць у вёсках Аздамічы Столінскага раёна Брэсцкай вобласці і Прыяміна Барысаўскага раёна Мінскай вобласці).*

ПІРАЖКІ З ГРЫБАМІ

Намачыць сушаныя грыбы на ноч, раніцай дробна нарэзаць і паварыць з цыбуляй і соллю да поўнай гатоўнасці, адцадзіць. У драную бульбу або цеста, расплясканае на далоні, як аладка, пакласці лыжку грыбной масы і, зрабіўшы піражок, пакласці ў чыгунок. Запоўніўшы такім чынам чыгунок піражкамі, заліць грыбным адварам і паставіць тушыць да гатоўнасці.

(З горада Сянно Віцебскай вобласці).

Вядучая рубрыкі **Рэгіна ГАМЗОВІЧ.**

«Голас Радзімы»
Галоўны рэдактар
Наталля САЛУК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом «Радзіма».

Наш адрас: 220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 288-11-97 (бухгалтэрыя), 288-12-80, 284-76-56, 288-17-82, (тэл./факс).
Галоўны рэдактар: 8029-6-88-17-82. E-mail: golas_radzimy@tut.by

ЧЫТАЙЦЕ «Голас Радзімы» Ў ІНТЭРНЭЦЕ: http://golas.promedia.by

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», могуць не супадаць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне №81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854. Аб'ём 2 друк. аркушы. Тыраж 2 151 экз. Заказ 1526. Падпісана да друку 25. 11. 2003 г. у 12.00.

Газета набрана і звярстана на рэдакцыйным настольна-выдавецкім комплексе. Знакам (R) пазначаны рэкламныя матэрыялы.

Аддрукавана на паліграфічным РУП «Чырвоная зорка» (220073, г. Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3).